Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-02-02

# На тым тыдні...

**23 студзеня** ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь пачала працаваць **кніжная выстаўка да юбілею беларускай святой Ефрасінні Полацкай**. Сёлета адзначаецца 910-годдзе з дня яе нараджэння. На выстаўцы каля абанемента можна пазнаёміцца са шматлікімі выданнямі, прысвечанымі беларускай асветніцы. Выстаўка працягнецца да 23 лютага, працуе штодзень акрамя суботы і нядзелі.

**23 студзеня** ў чытальнай зале рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі адбылося ўрачыстае **мерапрыемства, прысвечанае 115-годдзю з дня нараджэння** вядомага беларускага вучонага, акадэміка, Героя Сацыялістычнай Працы, былога прэзідэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча **Васіля Феафілавіча Купрэвіча**.

На імпрэзе адбылося адкрыццё выстаўкі «Акадэмік Купрэвіч (да 115-годдзя з дня нараджэння)», на якой прадстаўленыя дакументы і матэрыялы з рукапіснага архіва юбіляра, што ў 1989 годзе быў перададзены ў ЦНБ НАН Беларусі яго сынам Алегам Васільевічам і зараз захоўваецца ў фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. Сярод экспанатаў біяграфічныя матэрыялы (копія выпіскі з метрычнай кнігі, рукапісы асноўных манаграфіяў і інш.), дакументы, звязаныя з працай у Батанічным інстытуце імя У.Л. Камарова АН СССР і інш. Асобны раздзел прысвечаны даследаванням і ўспамінам пра жыццё і навуковую дзейнасць вучонага.




**24 студзеня** ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося ўрачыстае **адкрыццё** 10-й юбілейнай Рэспубліканскай мастацкай **выстаўкі «Арт-крок»** грамадскага аб'яднання «Міжнародная гільдыя жывапісцаў». Сябры аб'яднання – гэта вядомыя і паспяховыя мастакі нашай краіны. Штогод яны прадстаўляюць на суд гледачам свае працы. Сёлета ў выстаўцы бяруць удзел каля 50 беларускіх мастакоў. Выстаўка працягнецца да 24 лютага.

**26 студзеня** ў канцэртнай зале «Мінск» канцэртам «Легенды Вялікага Княства – Старажытная зямля» адкрыўся **Тыдзень дударскай музыкі**. У імпрэзе бралі ўдзел гурты «Testamentum Terrae», «Brevis», «Irdorath folk band», а таксама сярэднявечны Вулічны Тэатр «Шальмоўскі Тэатр Ды Грыза», гурт гістарычнага танца «Фламея» ды іншыя. Рыцарскі клуб «Мінская Унія "Меч і Ворон"» прадэманстраваў рыцарскія баі. 27 студзеня святочныя мерапрыемствы перамясціліся ў Брэст, а 28 студзеня – у Гомель (*пра гэтую імпрэзу падрабязней чытайце на стар. 3 сённяшняга нумара газеты*).

**27 студзеня** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прымалі прыхільнікаў мастацкага слова на **літаратурнай сустрэчы** з беларускім пісьменнікам **Міколам Маляўкам**. Вечар паклаў пачатак новаму музейнаму праекту «Пад нёманаўскім сонцам», прысвечанаму знакамітым землякам народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, людзям, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё беларускай культуры, літаратуры, мастацтва.

Праект адкрывае сустрэча з прызнаным творцам Міколам Маляўкам, ураджэнцам роднай Коласу Мікалаеўшчыны. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова і Васіля Віткі, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» нядаўна адзначыў сваё 70-годдзе. Для паэта мінулы год быў знакавым, і не толькі з нагоды юбілею. З друку выйшлі два новыя выданні: кніга паэзіі «Крыштальная галінка снегападу» і дакументальна-мастацкая аповесць «Коласаў абярэг». Прэзентацыя выданняў і стала асноўнай тэмай вечара.

**28 студзеня** ў сталічным Палацы дзяцей і моладзі вядомы фалькларыст з Любані, спецыяліст па традыцыйным танцавальным этыкеце і манеры выканання танцаў Сяргей Выскварка правёў **майстар-клас**. Арганізатары запрасілі ахвочых навучыцца «танцаваць "у народнай манеры", папоўніць запасы новай і карыснай інфармацыі пра танцы і не толькі...». Варта дадаць, што гэты чалавек з'яўляецца мастацкім кіраўніком узорнага фальклорнага калектыву «Верабейкі» (г. Любань), летась пад ягоным кіраўніцтвам адбылася танцавальная школа «Пятровіца».